

Пазнаёмцеся з прыказкамі пра Радзіму. Растлумачце іх сэнс.

## ПРЫКАЗКІ

- У сваім кра́і, як у ра́і.
- Кожная птушка сваё гняздо ведае.
- Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.
- Радзіма — матка, чужы́на — мачыха.

---

**Маўленчая размінка.** Прачытайце верш Раісы Раманчук. Правільна вымаўляйце гукі [ў], [дз’], [г], [ч], [ц’], спалучэнне гукаў [шч].

* * *

Крыні**ч**каю ла**г**однай
Няхай **цячэ** **г**амонка,
Няхай **шч**ыруе мова
Над любаю старонкай!
Няхай на роднай мове
Усе людзі разма**ў**ляю**ць**,
Радзіму, Мову, Ма**ці**
Ніяк не ра**здз**яляю**ць**!



***Пяшчо́та*** — пачуццё ласкі, мяккасці ў адносінах да каго-небудзь.
***Вячо́ркі*** — зборы вясковай моладзі зімовымі або асеннімі вечарамі для сумеснай работы, забавы.



Правообладатель Национальный институт образования

## МІКОЛА МЯТЛІЦКІ



### На мове роднай

Не проста ў словы я гуляю —
На мове роднай размаўляю.
У час світальны, вечаровы
Кажу пяшчоты цёплай словы:

— Дзень добры, сонейка над гаем!
Свяці ярчэй над родным краем,
Гука́й вясну з зямной дале́чы...
Вітанне шлю, марозны вечар!

Ты запалі́ ў нябёсах зоркі,
Няхай збяруцца на вячоркі,
Чаруюць нас красой нязводнай...
Я гавару на мове роднай.

1. З якімі незвычайнымі асобамі паэт размаўляе па-беларуску? Зрабіце слоўныя малюнкі яго размовы з сонейкам і вечарам.
2. Аб чым просіць аўтар у сонейка і марознага вечара?
3. Патлумачце сэнс выразу «Чаруюць нас красой нязводнай...».
4. Чаму радуецца і чым ганарыцца беларускі паэт Мікола Мятліцкі? Прачытайце адпаведныя радкі.
5. Якія чатырохрадкоўі патрэбна чытаць з апавядальнай інтанацыяй і ў павольным тэмпе? Якія — гучна і бадзёра?



Правообладатель Национальный институт образования